МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

# СТАРАСЛАВЯНСКАЯ МОВА

*Праграма для студэнтаў спецыялізацыі*
*“бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура”*
*факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск 2007**

**Распрацавала**
**А.А. Жалуновіч** кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры БДУ культуры і мастацтваў

**Рэцэнзенты**
Т.П.Казакова кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі літаратуры БГУ
С.А.Паўлава кандыдат філалагічных навук, дацэнт БДУ культуры і мастацтваў

Рэкамендавана да выдання прэзідыумам вучэбна-метадычнай рады БДУ культуры і мастацтваў ( пратакол № ад 2007 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Дысцыпліна “Стараславянская мова” з’яўляецца важным звяном у прафесійнай падрыхтоўцы высокакваліфікаванага настаўніка беларускай мовы. Яна з’яўляецца своеасаблівымі ўводзінамі ў славянскую філалогію. Засваенне звестак пра сістэму старажытнай кніжна-пісьмовай мовы славян забяспечвае неабходны пераход для вывучэння гістарычнай граматыкі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратурнай мовы, а праз іх – курса сучаснай беларускай мовы.

Мэтавыя ўстаноўкі гэтай дысцыпліны звязаны не толькі з лінгвістычнымі і агульнафілалагічнымі задачамі, але маюць вялікае грамадска-выхаваўчае значэнне.

Па-першае, курс мае на мэце закласці асновы ведаў экстралінгвістычнага характару: звесткі пра дзейнасць першаасветнікаў Кірыла і Мяфодзія, пра славянскія народы і мовы, пра моўную блізкасць і роднасць славянскіх народаў, пра ўмовы ўзнікнення пісьменнасці ва ўсходніх славян, пра месца старажытных славянскіх пісьмовых помнікаў, пра старaславянскія азбукі (глаголіцу і кірыліцу).

Па-другое, старaславянская мова раскрывае асноўныя заканамернасці развіцця фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу на моўных з’явах і фактах, без ведання якіх тлумачыць шматлікія асаблівасці сучаснай беларускай літаратурнай мовы і сучасных народных гаворак вельмі складана.

Па-трэцяе, для будучых настаўнікаў гэтая дысцыпліна мае не толькі адукацыйна-тэарэтычнае, але і практычнае значэнне. Атрыманыя веды і навыкі аналізу фанетычных, марфалагічных і лексічных асаблівасцей забяспечваюць прафесійную падрыхтоўку настаўніка і дапамагаюць яму ў практычнай школьнай працы.

У лекцыйны курс курса ўваходзяць толькі асноўныя пытанні праграмы. Лексічныя і сінтаксічныя з’явы старажытнага часу разглядаюцца ў працэсе аналізу і чытання тэкстаў на семінарскіх занятках. Шэраг тэм інфармацыйнага характару выносіцца для самастойнага вывучэння па прапануемай выкладчыкам літаратуры.

Па заканчэнні курса “Старaславянская мова” студэнты павінны *мець уяўленне аб*:

– значэнні кірыла-мяфодзіеўскіх традыцый для славянскага свету;
– гістарычных умовах утварэння і развіцця старaславянскай мовы;
– месцы і значэнні старaславянскай мовы ў сістэме філалагічнай падрыхтоўкі;
– праславянскай мове як дапісьмовай фазе развіцця славянскіх моў;
– ролі пісьмовых крыніц для лінгвістычнага аналізу;
– графічнай сістэме славян;
– гукавой сістэме старaславянскай мовы;
– марфалагічным ладзе старaславянскай мовы;
– сінтаксічным ладзе старaславянскай мовы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнты павінны *ўмець:*

– карыстацца тэрмінамі і паняццямі навучальнага курса;
– выкарыстоўваць веды па старaславянскай мове ў вывучэнні сучаснай мовы і літаратуры;
– выкарыстоўваць атрыманыя тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці;
– валодаць галоўнымі фактамі тэарэтычнага курса;
– вызначаць моўныя асаблівасці пры перакладзе старaславянскіх тэкстаў;

По вучэбным плане на курс "Стараславянская мова" адводзіцца 26 гадзін лекцыйных, семінарскіх заняткаў. На самастойную работу – 2 гадзіны.

Кантроль ведаў ажыццяўляецца на семінарскіх занятках і ў форме лабараторных работ пасля праходжання пэўных тэм курса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**
**курса "Стараславянская мова"**

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. | самаст. работа |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **Раздзел 1. Уводзіны** | | | | |
| Тэма 1. Прадмет і задачы дысцыпліны. Гісторыя ўзнікнення і развіцця стараславянскай пісьменнасці. Дзейнасць Кірылы і Мяфодзія | 1 | 1 | | |
| Тэма 2. Славянскія азбукі. Старажытныя пісьмовыя помнікі глагалічнага і кірылаўскага пісьма | 2 | | 1 | 1 |
| **Раздзел 2. Фанетыка** | | | | |
| Тэма 3**.** Асаблівасці вакалізму і кансанантызму ў праславянскай гукавой сістэме позняга перыяду. | 2 | 1 | 1 | |
| Тэма 4. Характарыстыка і паходжанне галосных гукаў стараславянскай мовы | 1 | 1 | | |
| Тэма 5. Змяненні галосных гукаў у стараславянскай мовы | 1 | 1 | | |
| Тэма 6. Характарыстыка і паходжанне зычных гукаў стараславянскай мовы | 2 | 2 | | |
| Тэма 7. Змяненні зычных гукаў у стараславянскай мове | 2 | 1 | 1 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Раздзел 3. Марфалогія** | | | | |
| Тэма 8. Характарыстыка лексічнага складу і марфалагічнага ладу стараславянскай мовы | 1 | 1 | | |
| Тэма 9. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі, асновы, асаблівасці тыпаў скланення, сінтаксічныя функцыі | 4 | 3 | 1 | |
| Тэма 10. Займеннік. Разрады, марфалагічныя асаблівасці, скланенне і сінтаксічныя функцыі займеннікаў | 1 | 1 | | |
| Тэма 11. Прыметнік. Разрады, формы, асаблівасці скланення, ступені параўнання, сінтаксічная роля прыметнікаў ў сказе | 1 | 1 | | |
| Тэма 12. Лічэбнік (словы з лікавым значэннем). Асаблівасці словаўтварэння, сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікамі і функцыянавання ў сказе | 1 | 1 | | |
| Тэма 13. Дзеяслоў. Словаўтварэнне, граматычныя катэгорыі і формы. Асаблівасці спражэння тэматычных і нетаматычных дзеясловаў | 3 | 3 | | |
| Тэма 14. Тыповыя разнавіднасці дзеяслоўных формаў і іх роля ў сказе | 1 | 1 | | |
| Тэма 15. Прыслоўе. Утварэнне і значэнне. Службовыя часціны мовы | 1 | | | |
| **Раздзел 4. Сінтаксіс** | | | | |
| Тэма 16. Асаблівасці сінтаксісу стараславянскай мовы | 4 | 2 | 1 | 1 |
| **Усяго** | 28 | 20 | 6 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СТАРАСЛАВЯНСКАЯ МОВА

## Раздзел 1. Уводзіны

### *Тэма 1. Прадмет і задачы дысцыпліны*

Прадмет і задачы курса “Стараславянская мова” ў сістэме філалагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў па роднай мове і літаратуры. Месца стараславянскай мовы сярод іншых славянскіх моў. Крыніцы вывучэння стараславянскай мовы. Дзейнасць славянскіх першаасветнікаў Кірылы і Мяфодзія.

### *Тэма 2. Славянскія азбукі і помнікі*

Славянскія азбукі, іх паходжанне. Гукавое і лікавае значэнне літар кірыліцы. Дыякрытычныя (надрадковыя) знакі. Характарыстыка помнікаў стараславянскай мовы (глагалічныя і кірылаўскія).

*Самастойная работа: Характарыстыка галоўных крыніц вывучэння стараславянскай мовы (рэферат).*

## Раздзел 2. Фанетыка

### *Тэма 3. Асаблівасці вакалізму і кансанантызму ў праславянскай гукавой сістэме позняга перыяду.*

Асаблівасці фанетычнай сістэмы праславянскай мовы: сістэма галосных (вакалізм), сістэма зычных (кансанантызм), асобныя галосныя. Тэндэнцыя да ўзыходнай гучнасці складу. Тэндэнцыя да гармоніі складу. Адметнасць праславянскага націску і інтанацыі.

### *Тэма 4. Характарыстыка і паходжанне галосных гукаў стараславянскай мовы*

Сістэма галосных гукаў стараславянскай мовы: паводле месца (пярэдняга і непярэдняга раду) і спосабу (верхняга, сярэдняга і ніжняга пд’ёму) ўтварэння; паводле працягласці гучання (доўгія, кароткія і звышкароткія).

Паходжанне галосных гукаў стараславянскай мовы: а) у выніку тэндэнцыі да пераўтварэння колькасных адрозненняў індаеўрапейскіх галосных у якасныя; б) у выніку дзеяння тэндэнцыі да ўзыходнай гучнасці складу; в) у выніку пераўтварэння колькасных адрозненняў індаеўрапейскіх галосных у якасныя і ў выніку дзеяння тэндэнцыі да ўзыходнай гучнасці складу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Змяненні галосных гукаў у стараславянскай мовы*

Пазіцыйныя змяненні галосных гукаў. Рэдукаваныя **ь,ъ** і іх лёс. Вынікі працэсу страты рэдукаваных. Галосныя ў пачатку слова. Чаргаванні галосных гукаў: колькасныя, якасныя і чаргаванні, абумоўленыя манафтангізацыяй дыфтонгаў і дыфтангічных спалучэнняў. Спалучэнне плаўных **r(р) і l(л)** з галоснымі. Змяненне дыфтангічных спалучэнняў ***or, *ol, *er, *el** паміж зычнымі. Змяненне дыфтангічных спалучэнняў ***or, *ol** у пачатку слова перад зычнымі. Праславянскія спалучэнні ***rъ, *lъ, *rь, *lь,** ў стараславянскай ды іншых славянскіх мовах.

### *Тэма 6. Характарыстыка і паходжанне зычных гукаў старaславянскай мовы*

Сістэма зычных гукаў старaславянскай мовы: а) паводле месца ўтварэння (губныя і язычныя); б) паводле спосабу ўтварэння (фрыкатыўныя, выбухныя, афрыкаты, праходна-змычныя і зычныя складанай артыкуляцыі); в) ад удзелу голасу і шуму санорныя ( сярод іх - насавыя) і шумныя; г) паводле цвёрдасці-мяккасці (цвёрдыя, а сярод іх – заднеязычныя **[г], [к], [х]**), мяккія. Складаўтваральныя плаўныя.

Паходжанне цвёрдых зычных гукаў старaславянскай мовы. Паходжанне мяккіх зычных гукаў старaславянскай мовы. Памякчэнне зычных перад галоснымі пярэдняга раду: першая палаталізацыя, другая палаталізацыя, трэцяя палаталізацыя.

### *Тэма 7. Змяненні зычных гукаў у старaславянскай мовы*

Спрашчэнне груп зычных. Дысіміляцыя ў спалучэннях **dt** і **tt.** Змяненне спалучэнняў **sk (ск), zg (зг), kt (кт), gt (гт)** перад галоснымі пярэдняга раду. Пямякчэнне зычных перад **[j]**. Палаталізацыя губных зычных пад уздзеяннем **[j]**. Змяненні ў канцы слова.

## Раздзел 3. Марфалогія

### *Тэма 8. Характарыстыка лексічнага складу і марфалагічнага ладу старaславянскай мовы*

Агульная характарыстыка марфалагічнага ладу старaславянскай мовы. Гістарычная сувязь словазмянення і словаўтварэння. Сродкі ўтварэння слоў і словаформаў. Лексічныя запазычанні старaславянскай мовы. Фразеалагічны фонд старaславянскай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Назоўнік. Граматычныя катэгорыі, асновы, асаблівасці тыпаў скланення, сінтаксічныя функцыі*

Словаўтварэнне назоўнікаў. Катэгорыі роду, ліку, склону. Узнікненне катыгорыі адушаўлёнасці. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***a**, ***ja,** на ***ŏ**, ***jŏ,** на ***ŭ,** на ***ĭ,** на ***ū,** на зычны **(n, r, s, nt).** Узаемадзеянне тыпаў скланення назоўнікаў. Сучасная парадыгма скланення назоўнікаў і яе адносіны да старажытных тыпаў іменнага скланення. Сінтаксічная роля назоўніка ў старславянскай мове.

### *Тэма 9. Займеннік. Разрады, марфалагічныя асаблівасці, скланенне і сінтаксічныя функцыі*

Разрады займеннікаў і іх марфалагічныя асаблівасці. Словаўтварэнне займеннікаў. Скланенне асабовых займеннікаў і зваротнага займенніка **сєбє**. Спосабы выражэння 3-асобы. Скланенне неасабовых займеннікаў (займеннае скланенне). Паходжанне канчаткаў займеннікавага скланення. Сінтаксічныя функцыі займенніка ў сказе.

### *Тэма 10. Прыметнік. Разрады, формы, асаблівасці скланення, утварэнне ступеней параўнання, сінтаксічная роля ў сказе*

Разрады прыметнікаў па значэнні і іх словаўтварэнне. Скланенне іменных (кароткіх) і поўных прыметнікаў. Утварэнне ступеняў параўнання прыметнікаў. Сінтаксічная роля прыметнікаў у старславянскай мове.

### *Тэма 11. Лічэбнік. Асаблівацi словаўтварэння, скланення, сінтаксічнай спалучальнасці з назоўнікам і функцыянавання ў сказе*

Словы з лікавым значэннем у старславянскай мове. Асаблівасці скланення асобных груп лічыльных слоў. Паходжанне складаных і састаўных лікавых назваў ( ад 11 і далей). Фарміраванне катэгорыі лічэбніка як асобнай часціны мовы. Характарыстыка парадкавых, дробавых і зборных лічэбнікаў. Лічэбнік як з’ява старaславянскага сінтаксісу.

### *Тэма 12. Дзеяслоў. Словаўтварэнне, граматычныя катэгорыі і формы дзеясловаў старэйшай пары*

Граматычныя катэгорыі і форма дзеяслова. Абвесны лад дзеяслова. Формаўтваральныя дзеяслоўныя асновы. Асабовыя формы цяперашняга часу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеясловаў нетэматычнага і тэматычнага спражэння. Сістэма формаў прошлага часу простыя (аорыст, імперфект) і складаныя (перфект, плюсквамперфект); Сістэма формаў будучага часу (будучы просты, будучы складаны I, будучы складаны II). Формы ірэальных ладоў: загадны і ўмоўны. Зваротныя формы дзеяслова. Неспрагальныя (іменныя) формы дзеяслова (інфінітыў і супін).

### *Тэма 13. Тыповыя разнавіднасці дзеяслоўных формаў і іх роля ў сказе*

Гісторыя дзеепрыметных формаў. Утварэнне і скланенне іменных (нячленных) і поўных (членных) дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану. Сінтаксічныя функцыі дзеяслоўных форм.

### *Тэма 14. Прыслоўе. Утварэнне, значэнне і сінтаксічная роля ў сказе*

Асаблівасці фарміравання прыслоўя як часціны мовы. Словаўтварэнне прылоўяў (адыменныя прыслоўі і афіксальныя вытворы). Ускосныя склоны назоўнікаў. Сінтаксічная роля прыслоўяў у старaславянскай мове.

### *Тэма 15. Службовыя словы. Выклічнікі*

Прыназоўнікі (невытворныя і вытворныя). Злучнікі простыя і складаныя. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі ў старaславянскай мове. Часціцы. Іх роля ў старaславянскім сказе.

## Раздзел 4. Сінтаксіс

### *Тэма 16. Асаблівасці сінтаксісу старaславянскай мовы*

Агульная характарыстыка сінтаксісу старaславянскай мовы. Развіццё розных тыпаў простых сказаў. Спосабы выражэння дзейніка і выказніка. Дадатковы дзеяслоўны член сказа: інфінітыў, супін, родны склон пры супіне. Даданыя члены сказа ў старaславянскай мове. Складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя сказы ў старaславянскім сінтаксісе. Зварот “давальны самастойны”.

*Самастойная работа: Рэшткі старaславянскага сінтаксісу ў сучасных славянскіх (рускай і беларускай) мовах (рэферат).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА


**Асноўная**

Горшков А.И. Старославянский язык. М.,1974.
Груцо А.П. Старославянский язык. Мн.,1999.
Иванова Т.А. Старославянский язык. М.,1977.
Каўрус А.А., Круталевіч М.М. Уводзіны ў старaславянскую мову. Мн., 1998.
Каўрус А.А., Круталевіч М.М. Стараславянская мова. Мн.: Бел.навука, 2005. – 386 с.
Кривчик В.Ф., Можейко Н.С. Старославянский язык. Мн.,1985.
Круталевіч М.М. Матэрыялы да лекцый па стараславянскай мове. Вучэбны дапаможнік. Мн.,1995.
Селищев А.М. Старославянский язык. Ч.1,2. М., 1951-1952.
Супрун А.Е. Старославянский язык. Мн.,1991.
Хабургаев Г.А. Старославянский язык. М.. 1974; 2-е изд., перераб. И доп. М.,1986.

**Дапаможнікі для практычных заняткаў**

Горшков О.В., Хмелевская Т.А. Сборник упражнений по старославянскому языку. М., 1985.
Дементьев А.А. Сборник задач и упражнений по старославянскому языку. М., 1975.
Жалуновіч А.А. Практыкум па стараславянскай мове для студэнтаў БУК. Мн.: БУК, 1996 – 18 с.

**Дадатковая**

Актуальные проблемы изучения и преподавания старославянского языка. М., 1984.
Беседина-Невзорова В.П. Старославянский язык. Харьков, 1962.
Вайан А. Руководство по старославянскому языку. М.,1952.
Елкина Н.М. Старославянский язык. М., 1960.
Карский Е.Ф. Надпись Самуила 993./ У кн.: Карский Е.Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М., 1962. – С.569-603.
Карский Е.Ф. Листки Ундольского, отрывок кирилловского евангелия. / У кн.: Карский Е.Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М., 1962. – С.565-568.
Карский Е.Ф. Славянская кирилловская палеография. М.,1979.
Кондрашов Н.А. Славянские языки. 3-е изд., перераб. И доп. М.,1986.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Львов А.С. Очерки по лексике памятников старославянской письменности. М., 1966.
Метвеева-Исаева Л.В. Лекции по старославянскому языку. / Под ред. В.И.Кодухова, В.В.Степановой. М., 1958.
Мейе А. Общеславянский язык. М., 1955.
Никифоров С.Д. Старославянский язык. М., 1955.
Новикова А.С. Старославянский язык. М., 1984.
Супрун А.Е., Калюта А.М. Введение в славянскую филологию. Мн., 1981.
Супрун А.Е. Праславянский язык. Мн.,1993.
Супрун А.Е. Славянские числительные. Мн., 1969.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ